# 2024 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2024 год з’яўляецца юбілейным.*

# 50 гадоў

**Шамякін, І. П. Атланты і карыятыды : Раман / І. П. Шамякін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1974. – 438 с.**




Спаўняецца паўстагоддзя з моманту першага самастойнага выдання «Атлантаў і карыятыдаў» Івана Шамякіна (1921–2004). Гэта раман, які лічыцца ў беларускай прозе адным з лепшых сацыяльна-псіхалагічных твораў пра рэаліі 1970-х гадоў. Назва рамана сімвалічная. Атлантамі і карыятыдамі ў архітэктуры называюць калоны ў выглядзе антычных скульптур, якія падтрымліваюць дахі збудаванняў (у старажытнагрэчаскай міфалогіі Атлант трымаў на сваіх плячах неба). Раман жа Івана Шамякіна пра людзей, на якіх трымаецца грамадства, яго культура.

Тыраж кнігі склалі 40 000 экземпляраў.





# «Атланты і карыятыды» : 50 гадоў







Выданне «Атлантаў і карыятыдаў» 1974 года мела каляровыя ілюстрацыі, выкананыя вядомым беларускім мастаком-графікам Людвігам Пятровічам Асецкім (1929–2005)

# «Атланты і карыятыды» : 50 гадоў

Герою рамана «Атланты і карыятыды» Максіму Карначу 47 гадоў. Ён галоўны архітэктар горада і клапоціцца пра яго аблічча і асяроддзе ў ім, таму выступае супраць размяшчэння на тэрыторыі горада хімічнага камбіната. Гэта будаўніцтва «перакрэсліць... ідэю Зарэчнага раёна — горада-саду», «знішчыць унікальную дуброву», «створыць адмоўныя праблемы, найбольшая з якіх — забруджванне ракі. А рака іх пакуль што — цуд, гонар, найчысцейшая з рэк». Галоўны архітэктар праяўляе бескампраміснасць, паслядоўнасць у адстойванні сваіх пазіцый і поглядаў.

У Максіма ёсць жонка Даша, але сямейнае жыццё не ладзіцца. Істэрыкі і рэўнасць Дашы настолькі празмерныя, што Максім думае пра развод. Але сваяк Дашы — старшыня гаркама, і асабістыя справы галоўнага архітэктара горада будуць мець непрыемныя наступствы не толькі для яго, але і для яго акружэння. Сямейную драму Карнача імкнуцца выкарыстаць яго праціўнікі, ён аказваецца ў адзіноце, перажывае дэпрэсію, імкнецца разабрацца ў сабе, асэнсоўвае мінулае, думае пра сэнс жыцця....

# «Атланты і карыятыды» : 50 гадоў



Андрэй Ягоравіч Макаёнак
(1920–1982)

Паводле прызнання Івана Шамякіна, ідэя напісаць твор пра архітэктараў узнікла ў яго падчас удзелу ў пасяджэнні бюро ЦК КПБ.

Прататыпам галоўнага героя рамана стаў выдатны беларускі драматург Андрэй Макаёнак, з якім аўтар сябраваў шмат гадоў.

Іншыя героі рамана таксама мелі рэальных прататыпаў. Вобраз Дашы, жонкі Максіма Карнача, Іван Шамякін пісаў з Алены, першай жонкі Андрэя Макаёнка, адносіны з якой, паводле ўспамінаў пісьменніка, у сябра не ладзіліся.

Прататыпам вобраза сакратара абкама Сасноўскага ў рамане стаў І. Я. Палякоў, які быў першым сакратаром Гомельскага абкама камсамола, калі Андрэй Макаёнак працаваў у роднай вёсцы Журавічы сакратаром райкама.

# «Атланты і карыятыды» : 50 гадоў

**Цытаты з рамана:**

● «Урачы хаваюць свае памылкі ў зямлю, архітэктары прыкрываюць плюшчом».
● «У роспачы крычаць на блізкіх людзей, а не на чужых»
● «Смех хораша зbліжае людзей, а трапны жарт — найлепшы ўступ у сур'ёзную размову».
● «Нічога так не гаворыць пра непрыязнасць, як звышветлівасць».
● «Калі ўвесь час баяцца, што цябе стукнуць па галаве, мімаволі нацягнеш чыгунны шлем».
● «Свет пераўтвараюць фантазёры».
● «Усе мы аб'ектыўныя, пакуль нас не кранаюць».
● «За празмернай сур'ёзнасцю часта хаваюцца абмежаванасць і пустата».
● «Зразумець, пра што не сказана, пра што балюча гаварыць, можа толькі чалавек з пэўным жыццёвым вопытам».
● «Перш чым стаць добрым спецыялістам, трэба стаць чалавекам. Проста чалавекам. Праўдзівым, шчырым...».
● «Трэба паважаць свае ўчынкі, нават памылковыя; калі яны прадыктаваны шчырым душэўныі парывам, ніколі нельга раскайвацца і караць сябе».
● «Агідныя тыя муж і жонка, якія дзесяцігоддзямі жывуць як сабака з кошкай, а на людзях выстаўляюць уяўны лад і шчасце».

# «Атланты і карыятыды» : 50 гадоў

Раман «Атланты і карыятыды» двойчы перавыдаваўся асобнай кнігай:
1985 г. – другое выданне тыражом 90000 экзэмпляраў у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Выданне мела прадмову, пасляслоўе В. Каваленкі, ілюстрацыі В. А. Тарасава;
2015 г. — выданне тыражом 2000 экзэмпляраў у выдавецтве «Папуры».
Таксама раман друкаваўся ў зборах твораў Івана Шамякіна: у 6-м томе шасцітомнага выдання 1979 г., у 4-м томе зборніка 2004 г. і ў 15-м томе дваццацітрохтомнага выдання 2013 г. Усе зборнікі былі падрыхтаваны выдавецтвам «Мастацкая літаратура».

Раман неаднаразова выдаваўся на мовах народаў былога Савецкага Саюза (рускай, украінскай, кіргізскай, узбекскай).
Па матывах твора П. Манастырскім быў напісаны тэатральны сцэнарый, па якім у 1978 г. на сцэне Куйбышаўскага акадэмічнага тэатра драмы імя М. Горкага пастаўлены спектакль у 2 дзеях «Атланты».

# «Атланты і карыятыды» : 50 гадоў

У 1980 годзе па матывах рамана «Атланты і карыятыды» рэжысёрам Аляксандрам Гутковічам быў зняты 8-серыйны аднайменны фільм.



Яўгеній Лазараў
у ролі Максіма Карнача, галоўнага архітэктара безыменнага беларускага абласнога горада



Усевалад Сафонаў
у ролі Герасіма Пятровіча Ігнатовіча, сакратара гаркама



Ала Ларыонава
ў ролі Дашы, жонкі Максіма Карнача



Аляксей Эйбажэнка
ў ролі архітэктара Шугачова Віктара, сябра Максіма Карнача

Больш інфармацыі пра іншыя ролі, выкананыя ў фільме «Атланты і карыятыды», можна знайсці па спасылцы: https://www.kino-teatr.ru/kino/movie/sov/311/titr/